**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у верасні**

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню ведаў.**

**1 верасня. ЦДБ.** У Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы для вучняў 4 класа СШ№1 г.Лунінца праведзены адзіны ўрок ведаў «Эстафета поколений: сохраняя прошлое, создаём будущее» на тэму "Мой край завецца Беларуссю". Вядучыя расказалі ўдзельнікам аб нашай краіне аб дасягненнях беларускага народа ў мінулым і сучаснасці, галоўных прадпрыемствах краіны, а таксама аб вядомых дзеячах культуры і мастацтва. Асаблівую цікавасць у дзяцей выклікала Кніга "Наш Прэзідэнт".

Амаль у кожнай бібліятэцы раёна прайшлі святочныя мерапрыемствы. Так, у **Бастынскай сельскай бібліятэцы** праведзена мерапрыемства «С книгой в страну знаний», у **Рэдзігераўскай сельскай бібліятэцы** прайшоў дзень цікавай інфармацыі "1000 невероятных открытий", у **Бальшачучавіцкай с.б.** – літаратурная вандроўка "Вучыцца трэба весела" і інш.

Да **Дня беларускага пісьменства** у бібліятэках Лунінецкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы прайшлі гістарычныя гадзіны, літаратурныя падарожжы, асветніцкія ўрокі і іншыя мерапрыемствы.

**ЦБ.** Прайшоў культурна-асветніцкі экскурс «Жывое і вечнае слова Скарыны». У ходзе мерапрыемства бібліёграф Іна Бушыла пазнаёміла вучняў СШ № 3 з гісторыяй узнікнення кніжнай справы Беларусі, біяграфіяй кнігадрукара Францыска Скарыны. Далей школьнікі прагледзелі відэаролік "Першадрукар Францыск Скарына", удзельнічалі ў віктарыне пра кнігі. Напрыканцы мерапрыемства вучні пазнаёміліся з кніжнай выставай "У вытокаў пісьменства".

**4 верасня. ЦДБ** прайшоў урок беларусазнаўства «Написанное остаётся», дзе дзеці пазнаёміліся з гісторыяй узнікнення беларускай мовы, пісьменства і кнігадрукавання. Сваю эрудыцыю ўдзельнікі змаглі прадэманстраваць, адказваючы на пытанні віктарыны «Вопросы древности – ответы современности», удзельнічаючы ў конкурсе «Литературные анаграммы», успамінаючы вялікіх беларускіх асветнікаў.

**5 верасня. Мікашэвіцкая г.б.** для ўдзельнікаў клуба інвалідаў «САМИ» прайшла гульня-конкурс «Да святыні з кнігай». Вядучая пазнаёміла ўдзельнікаў з гісторыяй узнікнення беларускай мовы, пісьменства і кнігадрукавання на нашай зямлі. Асаблівую ўвагу надалі дзейнасці першых асветнікаў Беларусі-Ефрасінні Полацкай, Сымона Буднага, Кірылы Тураўскага. Пагаварылі гэтак жа пра традыцыі, звязаныя са святкаваннем Дня пісьменства ў нашай краіне. Усе актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Беларуская кніга», гэтак жа ўдзельнічалі ў такіх конкурсах як «Переводчик», «Азбука», «Издатели». У канцы мерапрыемства вядучая прапанавала разгадаць крыжаванку «Истоки письменности».

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Напрыклад, у **Палескай сельскай бібліятэцы** для выхаванцаў дзіцячага сада прайшла экскурсія

“Вандроўка ў мінулае: ад кірыліцы да сучаснасці”. У **Міжлескай сельскай бібліятэцы** праведзены экскурс у гісторыю “Ад папірусу да кніг”. У **Вулькаўскай 2 сельскай бібліятэцы** бібліятэкар правяла літаратурную гадзіну “Словы кніжкі беларускай". Падчас гадзіны ўдзельнікі мерапрыемства пазнаёміліся з гісторыяй станаўлення беларускай мовы і знакамітымі дзеячамі асветы. Таксама дзеці пазнаёміліся з рознымі кнігамі па гісторыі беларускага пісьменства.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня бібліятэк.**

**10 верасня.** Напярэдадні прафесійнага свята на базе **Мікашэвіцкай гарадской бібліятэкі** адбыўся дзень прафесійных зносін «Современная библиотека. Инновационные технологии библиотечно-информационного обслуживания населения». Супрацоўнікі бібліятэкі гасцінна прынялі ў сябе калег і правялі экскурсію па абноўленых залах бібліятэкі. Пазнаёмілі з рэсурсамі і паслугамі бібліятэкі, з працай дзіцячага аддзялення, публічнага Цэнтра прававой інфармацыі і дзіцячага пакоя. Удзельнікі мерапрыемства паўдзельнічалі ў акцыі «Сундучок желаний». Дзень прафесійных зносін завяршыўся абмеркаваннем сучасных трэндаў у бібліятэчнай рабоце, абменам вопыту і напрацоўкамі. *(Лунінецкія навіны. 2025. 17 верасня. С.10)*

**11 верасня.** У цэнтральнай раённай бібліятэцы напярэдадні свята прайшоў дзень бібліяграфіі “У свет інфармацыі праз бібліятэку”. Бібліограф пазнаёміла вучняў СШ №1 з публічным Цэнтрам прававой інфармацыі, распавяла пра гісторыю ўзнікнення бібліятэк і знакамітых бібліятэках свету.

**ЦБ.** "Паспрабуй і ты" - пад такой назвай у бібліятэцы прайшоў Дзень самакіравання. Вучаніцы 9 класа СШ № 2 Ганна Стральчук і Мілана Чарнавокая на час «пераўвасобіліся» ў бібліятэкараў і прынялі на сябе іх прафесійныя абавязкі. Пад кіраўніцтвам бібліятэкараў яны абслугоўвалі чытачоў, афармлялі новыя кнігі, займаліся расстаноўкай фонду, наводзілі парадак на паліцах, выконвалі даведкі.

**ЦДБ.** Прайшоў дзень адчыненых дзвярэй “Сардэчна запрашаем у бібліятэку!” напоўнены займальнымі мерапрыемствамі і добрым настроем. Для юных наведвальнікаў бібліятэкары арганізавалі экскурсію па залах бібліятэкі.

Дзеці пазнаёміліся з дзіцячымі часопісамі і газетамі, кніжнымі выставамі, пагулялі ў займальныя гульні. Бібліятэкары распавялі, што такое «бібліятэка».

Амаль у кожнай бібліятэцы раёна прайшлі святочныя мерапрыемствы. Так, у **Рэдзігераўскай сельскай бібліятэцы** прайшоў фотаконкурс “Засветись в библиотеке”. У **Дзятлавіцкай сельскай бібліятэцы** таксама прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй “Кто куда, а я в библиотеку”. У **Любанскай сельскай бібліятэцы** прайшло тэматычнае мерапрыемства “Бібліятэка- свет ведаў". У Бастынскай сельскай бібліятэцы прайшоў літаратурны вечар-сустрэча, прысвечаны да Дня бібліятэк, “Бібліятэка. Людзі. Год. Жыццё”.

У **Люшчанскай сельскай бібліятэцы-клубе** былі падведзены вынікі «Любимые книги наших читателей», які праходзіў з 10 верасня па 14 верасня. Чытачы бібліятэкі актыўна прынялі ўдзел у квілце, напісаўшы сваю любімую кнігу і тым самым парэкамендаваўшы яе для чытання.

**11 верасня. У Мікашэвіцкай г.б.** адбыўся незвычайны ўрок «Знакомство с библиотекой» для вучняў 1 класа Мікашэвіцкай гімназіі. Дзеці апынуліся ў кніжным царстве, дзе іх чакалі чароўныя цуды. Работнікі бібліятэкі ў гульнявой і вершаванай форме расказалі дзецям аб абанеменце, чытальнай зале, аб правілах запісу ў бібліятэку і правілах паводзін. Школьнікі з вялікай цікавасцю слухалі аповед пра тое, як правільна абыходзіцца з кнігамі. Дзеці даведаліся, што слова бібліятэка адбылося ад двух слоў "Біблія" - кніга і “ тэка” — сховішча, а таксама пра тое, што кніга – гэта Цуд, якому больш за пяцьсот гадоў. Больш за ўсё дзецям спадабалася віктарына «Па старонках чароўных казак».
**11 верасня. У Мікашэвіцкай г.б.** прайшоў бібліятэчны вечар “Чароўны свет бібліятэк”. На мерапрыемстве прысутнічала беларускамоўная паэтка, удзельніца народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя» Цэнтральнай раённай бібліятэкі і народнай паэтычнай студыі «Муза» гарадскога Дома культуры Валянціна Іванаўна Трухнова. Яна распавяла пра свой шлях да творчасці і прачытала свае вершы. Паэтка падарыла бібліятэцы зборнікі сваіх вершаў.
**13 верасня. Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** адбылося свята вёскі «Здесь я живу и край мне этот дорог!». *(Лунінецкія навіны. 2025. 17 верасня. С.10)*
**15 верасня. ЦБ** удзельнікі народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя» адзначылі двайное свята – Дзень бібліятэк і юбілейны Дзень нараджэння ўдзельніцы студыі Людмілы Яфімавай.
У пачатку сустрэчы літаратары Лунінеччыны павіншавалі бібліятэкараў з прафесійным святам і зачыталі вершы, прысвечаныя прафесіі бібліятэкара. Затым павіншавалі таленавітую паэтэссу Людмілу Яфімаву.
**17 верасня.** у чытальнай зале **цэнтральнай раённай бібліятэкі імя М.Калінковіча** адбыўся міжнародны тэлемост «В единстве наша сила» які звязаў гарады-пабрацімы Лунінец (РБ) і Палеск (РФ).

У 2024 годзе было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж ДУК «Лунінецкая раённая бібліятэчная сістэма» і МБУК «Міжпасяленчая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Палескай сталічнай акругі. З тых часоў паміж калегамі падтрымліваюцца цесныя сяброўскія сувязі. У бібліятэк шмат агульных інтарэсаў, свая гісторыя ўзнікнення супрацоўніцтва, сумесныя праекты. І чарговая сустрэча адбылася ў важны дзень для абедзвюх дзяржаў- Дзень народнага адзінства.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел члены літаратурных аб'яднанняў дзвюх бібліятэк-народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя» (Лунінец) і «Высокая страфа» (Палеск).
У анлайн фармаце прагучалі вершы, прысвечаныя радзіме, напоўненыя любоўю і гонарам за сваю зямлю. У рамках сустрэчы калегі з горада Палеска выказалі нямала цёплых слоў пра Беларусь, падзяліліся ўспамінамі пра наведванне Рэспублікі Беларусь, пра ветлівасць жыхароў нашай сінявокай краіны.

**23 верасня.** У **Мікашэвіцкай гарадской бібліятэцы** адбыўся дыялог «Толерантность сегодня – мир всегда», з вучнямі 2 класа СШ №2 г.Мікашэвічы. У ходзе мерапрыемства дзеці даведаліся, што азначае слова «талерантнасць», чаму талерантнасць стала актуальнай у сучасным свеце, як трэба ставіцца да пачуццяў і да чужога меркавання, да паводзін і да светапогляду іншага чалавека. Затым, вучні прынялі ўдзел у гульні-падарожжы па нашай Радзіме Беларусі, па станцыях «Мир», «Кленовая», «Васильковая», «Букварная».
**24 верасня.** У **Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы** у рамках народнага Відэакалендара "Сонцазварот" прайшло фальклорнае свята «Дажынкі», з удзелам вучняў 4 класа СШ №1 г.Лунінца.
**25 верасня. У Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ім. М. Калінковіча** адбыўся прававы прафсаюзны прыём на тэму «Режим труда и отдыха». Падчас сустрэчы супрацоўнікі ДУК "Лунінецкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма" і ДУК "Цэнтралізаваная клубная сістэма Лунінецкага раёна" змаглі задаць пытанні Таццяне Сяргееўне Кажанавай, старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму, і Васілюку Сяргею Рыгоравічу, галоўнаму прававому інспектару працы Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму. У мерапрыемстве таксама прыняла ўдзел супрацоўнік пракуратуры. Прававыя інспектары далі тлумачэнні прысутным па пытаннях выканання працоўнага заканадаўства, правоў работнікаў і асаблівасцяў рэгулявання працоўнага часу. Пазней любы жадаючы зможа бясплатна атрымаць кансультацыі прафсаюзных юрыстаў па пытаннях, звязаных з абаронай працоўных правоў і сацыяльна-эканамічных інтарэсаў.
**25 верасня.** у рамках Адзінага дня бяспекі для супрацоўнікаў **Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ім. М. Калінковіча і Лунінецкай Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі праведзена** прафілактычнае мерапрыемства па папярэджанні надзвычайных сітуацый.
Адзіны дзень бяспекі праводзіцца штогод з мэтай навучання работнікаў арганізацый правільным дзеянням ва ўмовах пажараў і няштатных сітуацый, а таксама дзеянням па аказанні першай дапамогі. На мерапрыемства была запрошана старшы інспектар сектара прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Лунінецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Марына Качура.
**26 верасня.** Адбылося ўрачыстае мерапрыемства «Не обрывается земная связь…» з нагоды прысваення імя М.Калінковіча цэнтральнай раённай бібліятэцы. Былі аформлены кніжныя выставы «Николай Калинкович – исследователь Полесья» и «Полесские дороги Александра Блока», таксама быў аформлены тэматычны ўгалок дзе былі прадстаўлены асабістыя рэчы пісьменніка. У ходзе мерапрыемства вершы, прысвечаныя Мікалаю Калінкавічу, чыталі ўдзельніцы народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Літаратурная правінцыя» Анастасія Пратасавіцкая і Вольга Грыдзюшка.

Настаўнік СШ № 2 г.Лунінца Святлана Мікалаеўна Кузьміч распавяла пра літаратурны праект «Літаратурная Лунінеччына», які рэалізуецца ў школе.

Успамінамі з дзяцінства падзялілася сястра пісьменніка Валянціна Мікалаеўна. Аб сумеснай працы з пісьменнікам прысутным распавяла Наталля Іванаўна Казанкова.

Напрыканцы ўрачыстага мерапрыемства адбылася цырымонія ўскладанне кветак да помніка Мікалая Калінковіча каля Лунінецкай цэнтральнай раённай бібліятэкі ім. М. Калінковіча.